ные школы в китайской живописи свидетельствуют об оживлении мыслительного процесса и формировании плюрализма. Перспективы китайской живописи невероятно широки, в том числе и для китайского пейзажа «шан-шуй».


1. *Debicki, J.* History of Western Art (Revised For-color Edition) / J. Debicki, J. f. Favre, D. Grunewald. – Хайнань : Изд-во Хайнан. ун-та, 2014. – 327 с.

2. *Цзун, Бин.* Предуведомление к изображению гор и вод / Бин Цзун ; пер. В. В. Малявина // Антология даосской философии ; сост. В. В. Малявин, Б. Б. Виногродский ; отв. ред. Н. Л. Сухачев. – М. : Янус-К, 1994. – 604 с.

3. 杨牧之《老子》外语教研出版社, 2011 年版=. *Ян, Мучжи.* Лао-Цзы / Мучжи Ян. – Пекин : Изд-во преподавания и исследования иностранных языков, 2009. – 264 с. – (Китайская классика).


# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ І ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ СРОДКАМІ ЭКСПАЗІЦЫЙНА-ВЫСТАВАЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛІТАРАТУРНЫХ МУЗЕЯЎ)


***І. Г. Лупашка,***

*кандыдат культуралогіі, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеезнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


Музеі розных профіляў пры значнай колькасці агульных рыс маюць і адметнасці ў сваёй дзейнасці. Асноўным сродкам прэзентацыі гісторыка-культурнай (у тым ліку літаратурнай) спадчыны музейнымі сродкамі з’яўляецца экспазіцыя. У сучасным разуменні музейная экспазіцыя – гэта мэтанакіраваная і навукова абгрунтаваная дэманстрацыя музейных прадметаў, якія кампазіцыйна арганізаваны, забяспечаны каментарыем, тэхнічна і па-мастацку аформлены і ў выніку ствараюць спецыфічны музейны вобраз прыродных і грамадскіх з’яў. Музейныя экспазіцыі, якія ствараюцца часова, кваліфікуюцца як музейныя выстаўкі [3, с. 766]. Заўважым, што на практыцы гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паняцці часам суіснуюць паралельна. Для таго, каб падкрэсліць доўгатэрміновы характар дзеяння музейнай экспазіцыі, ужываюцца і такія вызначэнні, як стацыянарная экспазіцыя, пастаянная экспазіцыя.

Пры вызначэнні асноўнай мэты, дзеля якой ствараецца літаратурная экспазіцыя, існуюць пэўныя супярэчнасці. Некаторыя даследчыкі лічаць, што экспазіцыя павінна даваць адказы на пытанні, якія ўзніклі ў працэсе знаёмства з літаратурнымі творамі. Такая думка шырока распаўсюджана ў румынскім літаратурным музеязнаўстве. Яна прадугледжвае падрыхтаванасць наведвальніка да ўспрыняцця экспазіцыі, валоданне звесткамі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Іншы погляд выказвае германскі даследчык В. Бартэль, які вызначае літаратурную экспазіцыю як сукупнасць музейнай інфармацыі аб літаратуры і творчым працэсе. Ён лічыць, што асноўная мэта літаратурнай экспазіцыі – даць стымул наведвальніку для азнаямлення з творчай спадчынай пісьменніка [1, с. 4]. Нам падаецца гэта думка больш слушнай у сувязі з тым, што сучасны музей усё больш успрымаецца як камунікатыўны цэнтр вольнага часу, куды наведвальнікі прыходзяць, каб адпачыць, і далёка не ўсе з іх належным чынам падрыхтаваны, што не выключае музейнага абслугоўвання на высокім узроўні.

З развіццём музеязнаўства змянялася і разуменне таго, што павінна ўяўляць сабой літаратурная экспазіцыя. Сёння літаратурныя і мемарыяльныя экспазіцыі – сінтэтычныя ўтварэнні, якія змяшчаюць у сабе элементы этнаграфічнага, мастацкага, краязнаўчага, гістарычнага характару.

Адзначым, што літаратурны музей мае спецыфіку ў камплектаванні збораў. Відавочна, што ад гэтага залежыць і характар экспазіцыйнага матэрыялу. Экспазіцыйныя комплексы ў літаратурным музеі (як і ў іншых) могуць быць пабудаваны як на аднародных, так і на разнародных матэрыялах. Аднак ёсць адно істотнае выключэнне: у музейнай экспазіцыі не можа быць комплексу, цалкам пабудаванага на тэкстах. Тэкст можа выступаць у якасці экспаната, але ён не павінен адыгрываць галоўную ролю ў экспазіцыйным комплексе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія дзесяцігоддзі ў літаратурных музеях адбыўся паварот ад манаграфічнага паказу жыцця і творчасці пісьменнікаў да больш шырокага адлюстравання ўсяго гісторыка-літаратурнага працэсу. Перад літаратурнымі музеямі стаіць важная задача – зафіксаваць гісторыю функцыянавання літаратуры ў грамадстве ў розныя гістарычныя эпохі. Неабходна адзначыць і яшчэ адзін аспект, у якім праяўляюцца адметнасць і складанасць стварэння літаратурнай экспазіцыі. Літаратурныя дзеячы часцей за ўсё з'яўляюцца таленавітымі не толькі ў адной галіне, але і ў іншых творчых сферах, такіх як мастацкая, тэатральная, рэжысёрская, і маюць актыўную грамадска-палітычную пазіцыю. Нельга забываць і аб асаблівай сферы міжасобасных і міжгрупавых узаемаадносін, пэўным коле кантактаў творчых людзей. Звычайна ў гэтую сацыяльную праслойку ўваходзяць знакамітыя людзі той ці іншай эпохі, узаемаадносіны з якімі таксама неабходна адлюстраваць у экспазіцыі.

У залежнасці ад мэты экспазіцыі выкарыстоўваюцца разнастайныя метады групавання экспанатаў у экспазіцыйнай прасторы: сістэматычны, тэматыка-храналагічны (ілюстрацыйны), ансамблевы, вобразна-сюжэтны [4, с. 8]. Акрамя таго, на адной экспазіцыі можа быць выкарыстана некалькі разнастайных метадаў.

Прааналізаваўшы асноўныя экспазіцыі выстаўкі, якія дзейнічалі ў літаратурных музеях Беларусі ў апошнія два дзесяцігоддзі, лічым, што большасць стацыянарных літаратурных экспазіцый створана з дапамогай тэматыка-храналагічнага метаду і сістэмы метадаў (комплексны метад).

Адна з найноўшых стацыянарных экспазіцый Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы створана комплексным метадам. Яе адкрыццё было прымеркавана да 130-годдзя з дня нараджэння паэта. У якасці галоўнай мэты экспазіцыі аўтары вызначаюць паказ жыцця і творчасці Янкі Купалы ў нацыянальным, еўрапейскім і сусветным кантэксце, ролі пісьменніка ў гісторыі нацыянальнай літаратуры, культуры, станаўленні беларускай дзяржаўнасці [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошні час пашырылася выкарыстанне сістэмы вобразна-сюжэтных метадаў. Яе аўтар Т. Палякоў лічыць, што кожная экспазіцыя непаўторная сваёй арганізацыяй экспанатаў, гэта значыць вобразнай сістэмай. Сюжэт і драматургія экспазіцыйнага вобраза будуюцца праз такія структурныя элементы, як завязка, кульмінацыя і развязка [4, с. 9–10].

Прыкладам экспазіцыі, створанай комлексным метадам, які ў дадзеным выпадку спалучае вобразна-сюжэтны, ансамблевы і тэматыка-храналагічны метады, можа быць экспазіцыя музея-сядзібы Міцкевічаў «Завоссе». Дакладных апісанняў інтэр'ера дома ў Завоссі не захавалася. Тое, што паўстае перад нашымі вачыма, – літаратурна-мастацкі вобраз, які створаны аўтарамі экспазіцыі на падставе дакументальных крыніц канца XVIII – пачатку XIX ст. і тых паэтычных ілюстрацый, якія намаляваў нам А. Міцкевіч у сваёй сусветна вядомай паэме; адсюль і ўмоўная назва экспазіцыі – «Вяртанне пана Тадэвуша».

Прадмет асобнага даследавання – часовыя выстаўкі. Стацыянарныя экспазіцыі і часовыя выстаўкі, хоць і маюць шмат агульных рыс, адрозніваюцца мэтамі і задачамі. Калі першыя ствараюцца як усебаковае адлюстраванне жыцця і творчасці пісьменніка (ці асобнага перыяду яго дзейнасці) або прэзентацыя пэўнага гісторыка-літаратурнага перыяду і разлічаны на доўгі час, то другія часцей за ўсё прысвечаны знамянальнай літаратурнай даце ці нейкай праблеме.

Сучасныя даследчыкі прыводзяць некалькі асноўных тыпаў музейных выставак: тэматычныя, фондавыя, справаздачныя, юбілейныя і інш. [Там жа, с. 50]. Трэба адзначыць, што фондавыя і справаздачныя выстаўкі літаратурнымі музеямі ствараюцца даволі рэдка. У аснове тэматычных выставак – пэўны сюжэт, а юбілейныя прысвячаюцца знамянальнай літаратурнай даце ці падзеі (юбілей пісьменніка, літаратурнага згуртавання і г. д.).

Доўгі час лідарам па стварэнні часовых выставак сярод літаратурных музеяў Беларусі быў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (ДМГБЛ), што тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі. На жаль, гэты музей да сённяшняга дня не мае стацыянарнай экспазіцыі. Трэба адзначыць, што на доўгі час гэты «мінус» супрацоўнікі здолелі ператварыць у сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адметнасць: у музеі заўсёды можна было ўбачыць нешта новае, цікавае для наведвальнікаў (зараз музей зачынены на капітальны рамонт). За апошнія 15 гадоў музеем створана больш за дваццаць юбілейных і тэматычных выставак, сярод якіх «Алесь Адамовіч. А для Вечнасці – Беларусь» (да 75-годдзя пісьменніка, 2002), «Трывожнае шчасце пісьменніка» (да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна», 2006), «Свет шчодры. Свет мяне паўторыць…» (да 80-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча, 2010), «Пакуль баліць душа» (да 20-й гадавіны Чарнобыльскай трагедыі, 2006), «Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам…» (2010) і інш.

Наватарствам ДМГБЛ трэба лічыць яго працу з пісьменнікамі-сучаснікамі. Гэта вельмі складаная праца, паколькі гаворка ідзе аб музеефікацыі жывых дзеючых сістэм. Пачынальнікам гэтай справы стала выстаўка 1995 г., прысвечаная Васілю Быкаву яшчэ пры жыцці пісьменніка. Яна стала штуршком для правядзення выставак, прысвечаных літаратарам нашага часу – Пімену Панчанку, Нілу Гілевічу, Івану Шамякіну. Такі напрамак дзейнасці музея падаецца вельмі перспектыўным, паколькі дакументаванне сучасных літаратурных працэсаў пакуль яшчэ з’яўляецца праблемай літаратурных музеяў.

Практычна не выкарыстоўваецца літаратурнымі музеямі сістэматычны (калекцыйны) метад пабудовы экспазіцый, што тлумачыцца яго спецыфікай, а менавіта неабходнасцю дэманстрацыі калекцыі аднатыпных прадметаў. Як адзначалася, большасць музейных прадметаў літаратурных музеяў – плоскасныя матэрыялы, якія будуць губляцца пры дэманстрацыі сістэматычным метадам. Звычайна гэты метад выкарыстоўваецца, калі мэтай выстаўкі з’яўляецца правядзенне навуковага даследавання музейнымі сродкамі.

Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць літаратурных музеяў развіваецца ў рэчышчы сусветных тэндэнцый. Тым не менш назіраецца пэўная адметнасць у падыходах да прэзентацыі літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны, што абумоўлена мэтамі і задачамі літаратурных экспазіцый, а таксама спецыфікай фондавых збораў.

РЕПОЗИТОРИИ БГУКИ

*1.* Актуальные проблемы советского музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; редкол.: Л. И. Арапова [и др.]. – М. : [б. и.], 1987. – 122 с.

*2.* Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы [Электронны рэсурс] // Навіны музея. – Мінск, 2013. – Рэжым доступу: http://kupala-museum.by. – Дата доступу: 01.04.2017.

*3. Закс, А. Б.* Музейная экспозиция / А. Б. Закс // Российская музейная энциклопедия / редкол.: В. Л. Янин [и др.]. – М. : Прогресс : РИПОЛ классик, 2005. – 846 с.

*4. Сташкевіч, А. Б.* Стварэнне музейных экспазіцый. Этап навуковага праектавання / А. Б. Сташкевіч ; Беларус. ін-т праблем культуры // Навуковае праектаванне музейных экспазіцый : навук.-метад. зб. – Мінск : БелІПК, 1996. – Вып. 1. – 60 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАЛАДЗЁЖНЫ КЛУБ ЯК АДНА З ФОРМ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў МУЗЕЙНАЙ ПРАСТОРЫ

***В. І. Мазалеўскі,***
*старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»*

У адукацыйным працэсе сённяшняга дня актуальным застаецца пытанне выхавання новага пакалення, зацікаўленага ў гарманічным развіцці грамадства і здольнага рэалізаваць свае творчыя і духоўныя патрэбнасці. У дадзенай працы мы паспрабуем прасачыць цэлы ланцужок выхаваўчага працэсу: сям’я – школа – музей. Задачай сям’і з’яўляецца выхаванне новых прадстаўнікоў грамадства, якія нясуць у сабе генетычныя каштоўнасці роду. Задачай школы з’яўляецца не толькі адукацыйная дзейнасць, але і выхаванне ў чалавеку маральных каштоўнасцей. Музей у выхаванні падлетка сінтэзаваў у сабе намаганні сям’і і школы праз маладзёжнае аб’яднанне – клуб.

Музей валодае вялікім адукацыйным патэнцыялам. У ім падлетак мае магчымасць вывучаць багаты культурны і гістарыч-